# Берасцейскі універсітэт

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 11 (131)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
2 сакавіка 2010 года


## Сёння ў нумары:


- **«И пусть вдохновлённые пишут об этом...»**
22 лютага адбыўся традыцыйны адкрыты універсітэцкі конкурс чытальнікаў «Таямніцы слова і думкі»
стар. 3

- **Студэнты жартуюць**
стар. 5

- **Заслужаны трэнер і ветэран**
Пачынаем рубрыку, прысвечаную 65-й гадавіне Вялікай Перамогі. У гасцёўні газеты ветэран Вялікай Айчыннай вайны Я.М. Шукевіч
стар. 6

- **Сустрэліся два святы**
Віншаванні да Дня абаронцы Айчыны і Міжнароднага жаночага дня атрымаеце на
стар. 7

- **Што рабіць у Дзень нараджэння?**
19 лютага юрыдычны факультэт святкаваў 14-годдзе. Падрабязна аб гэтым чытайце на
стар. 8


# ДАНІНА



# ПАМЯЦІ

***24 лютага на Савеце універсітэта падведзены вынікі абласнога этапу VI Рэспубліканскага конкурсу творчых прац навучэнцаў і студэнтаў па сацыяльна-гуманітарных навуках «Вялікая Перамога ў памяці нашай жыве», прысвечанага 65-й гадавіне перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.***

***7 чалавек (на фота) з розных універсітэтаў і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі атрымалі дыпломы пераможцаў і прызёраў абласнога туру конкурсу. Іх працы рэкамендаваны да ўдзелу ў фінальным, рэспубліканскім этапе.***

***Сярод пераможцаў ёсць і нашы студэнты: З. Кузьмук (гістарычны факультэт – I месца), Т. Барысюк (гістарычны факультэт – II месца) і К. Анхім (псіхолага-педагагічны – III месца). Поспехаў вам на рэспубліцы!***

## ШТО Ў СВЕЦЕ?

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

С 14 по 18 февраля в Республике Беларусь прошла регистрация инициативных групп кандидатов в депутаты местных Советов 26-го созыва. С 19 февраля по 15 марта идёт выдвижение кандидатов в депутаты.

● ● ●

Верховный Совет Крыма обратился в Конституционный суд Украины с просьбой признать указ бывшего президента Виктора Ющенко о присвоении звания Героя Украины Степану Бандере несоответствующим Основному закону.

В обращении говорится, что указы о награждении Бандеры самым почётным украинским званием и о признании нескольких националистических организаций борцами за независимость страны реабилитируют «деятельность фашистских приспешников». Степан Бандера возглавлял Организацию украинских националистов (ОУН), которая выступала за создание независимого государства. В годы Великой Отечественной войны подразделение Украинской повстанческой армии (УПА), входившее в состав ОУН, сначала сотрудничало с немцами, а позже воевало как против гитлеровских, так и против советских войск.

● ● ●

Долговые и бюджетные проблемы Греции стали главной темой на заседании совета министров ЕС по экономике и финансам (Экофин), который прошел 15 и 16 февраля в Брюсселе. Финансовые проблемы Греции стали причиной падения курса евро и заметного подъема доллара по отношению к европейской валюте. Подорожание доллара ведёт к снижению мировых цен на нефть, что создаёт уже непосредственную опасность для экономик многих стран.

Греция подверглась критике партнёров по ЕС за высокий дефицит бюджета, который почти в четыре раза превысил максимально допустимый уровень, предусмотренный пактом стабильности еврозоны. Некоторые эксперты допускают даже выход Греции из зоны евро.

## ФОТАФАКТ

***23 лютага ва універсітэце ганаравалі ветэранаў Узброеных сілаў, што працавалі ці працуюць у нашай alma mater.***

***Ветэраны ўсклалі кветкі да помніка воінам-інтэрнацыяналістам і вярнуліся ва універсітэт, дзе са святам іх павіншавала кіраўніцтва навучальнай установы.***

***Традыцыйна ганараванне ветэранаў суправаджаецца ўручэннем членскіх білетаў студэнтам, якія толькі ўступілі ў грамадскае аб'яднанне «БРСМ». На гэты раз білеты атрымалі студэнт факультэта фізічнага выхавання Яўген Дзяркач і студэнткі сацыяльна-педагагічнага факультэта Таццяна Угляніца і Ганна Сахарчук.***



*Ветэраны пасля ўскладання кветак да помніка воінам-інтэрнацыяналістам*

# НАШЫ НАВІНЫ

***26 лютага навукова-метадычны савет універсітэта наладзіў круглы стол «Педагагічнае суправаджэнне працы з адоранымі і здольнымі дзецьмі: удзел універсітэта».***

***Пасяджэнне было выязным і праходзіла ў гімназіі № 6 г. Брэста.***

● ● ●

***24 лютага ў Брэсцкім гарвыканкаме адбылася семінар-вучоба для студэнтаў двух брэсцкіх універсітэтаў, а таксама старшыняў саветаў моладзі прадпрыемстваў і арганізацый горада.***

***Тэмай размовы гарадскіх улад з моладдзю была «Палітычная культура і ідэалагічныя працэсы. Выхаванне палітычнай культуры ў моладзі».***

● ● ●

***19 лютага адбылася адзіная гадзіна інфармавання, на якой з дакладам «Палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне абароны (да Дня абаронцы Айчыны і Узброеных сілаў)» выступіў намеснік ваеннага камісара Брэсцкага абласнога ваенкамата М.А. Крывушын.***

● ● ●

***19 лютага ва універсітэце працаваў рэспубліканскі семінар «Роля сацыяльнага партнёрства ў ажыццяўленні валанцёрскай дзейнасці», арганізатарамі якога выступілі кафедра сацыяльна-медыцынскіх дысцыплін сацыяльна-педагагічнага факультэта, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і аддзел па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама.***

● ● ●

***19 лютага начальнік упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама М.А. Ціханчук сустрэўся са студэнтамі, унесенымі ў перспектыўны кадравы рэзерв аблвыканкама. Студэнтам расказалі пра структуру ўпраўлення адукацыі і далі падрабязную інфармацыю аб стане і перспектывах адукацыі ў Брэсцкай вобласці.***

ПАДЗЕЯ

## Всё замерло

*Всё замерло…*
*Не слышно тихих пений*
*В моём саду заночевавших птиц.*
*Обнявшиеся кронами деревья*
*Хранят покой сомкнувшихся ресниц.*

*Молчание, как старое поверье,*
*Не потревожит мерный*
*сердца стук.*
*Согласие, несущее спасенье,*
*Как сдавленный,*
*застывший в горле звук.*

*Лазурью переполненное небо,*
*В котором было сладко так тонуть,*
*Оборвалось и стало тёмно-серым,*
*Сложило руки и сдавило грудь.*

*Всё замерло и резко обнажило*
*Моей души губительный застой.*
*Как будто жизнь свою*
*Я завершила,*
*А умер за меня кто-то другой…*

*Е. Лапич*
*(юридический факультет)*

# И пусть вдохновленные пишут об этом...

**Помню, сколько впечатлений оставил мне конкурс чтецов «Тайны слова и мысли–2009». Воодушевлённая им, я решила сама принять участие в конкурсе в нынешнем году и непременно найти своего слушателя.**

Подготовка к конкурсу велась тщательно, что и говорить. Ведь нужно было позаботиться не только о произношении и интонации, но и создать целостный сценический образ.

Самым трудным, пожалуй, был начальный этап подготовки – выбор репертуара. Ведь существует огромное количество авторов, тем и произведений, а выбрать нужно лишь одно. Взор пал на томик Роберта Рождественского, ведь многие его стихотворения широко известны, некоторые в качестве песен. Перелистывая страницы, я вновь и вновь оставляла закладки: каждое произведение мне казалось особенным, красивым, неповторимым. Прочитав всю книгу, я поняла, что очень хорошо запомнила одно стихотворение – «Коррида в Лиме». И не удивительно: оно отличается необычной темой, красочностью образов, да и бык – главный герой – предстаёт в новом амплуа.



Следующий этап в подготовке – подбор костюма. Мне так хотелось представить зрителям целую корриду с её страстями и красочностью! Мои друзья надо мной только посмеялись: «Ты же не на театральный идёшь, а на конкурс чтецов». В итоге мой образ упростился, и я, уставившись в зеркало, начала репетиции. Старания мои не пропали даром: я успешно прошла прослушивание и попала в финал, который состоялся 22 февраля в конференц-зале университета.

Участники традиционно соревновались в двух отделениях: исполнительском и авторском. Приятно было отметить, что многие конкурсанты принимают участие не в первый раз и не останавливаются на достигнутом. Репертуар был разным, исполнители, в основном, выбирали поэтов 20-го века.

Все участники были хороши. В. Кочурко и Е. Надеина (БрГТУ) подарили публике настоящий спектакль; К. Петрович (БрГУ имени А.С. Пушкина, факультет иностранных языков) покорила зрителей харизмой, О. Балюк (БрГУ имени А.С. Пушкина, филологический факультет)) – красотой белорусской речи, А. Альхименко (БрГУ имени А.С. Пушкина, филологический факультет) и Е. Карлюк (БарГУ) – оригинальностью идеи и стиля.

Выбор лучших жюри давался нелегко – участники и болельщики долго томились в ожидании. В итоге лучшими в исполнительском отделении стали: С. Серая (БрГУ имени А.С. Пушкина, математический факультет) В. Кочурко и Е. Надеина, М. Манец (гимназия № 1 г. Бреста), Ю. Бурвин (Пинский колледж учреждения образования «БрГУ имени А.С. Пушкина»); в авторском отделении – А. Чимбур (ПолесГУ), Е. Карлюк (БарГУ), А. Альхименко и И. Рабчук (юридический факультет БрГУ имени А.С. Пушкина).

Расставаясь с ребятами из БрГТУ (которые на протяжении всего конкурса подкармливали меня конфетами!), я пообещала встретиться с ними в следующем году. Ну а что касается моей мечты – она сбылась: я нашла своих зрителей на последнем ряду…

*В.Черник,*
*(филологический факультет)*



АКТУАЛЬНА

# БЫЦЬ АЛЬБО НЕ БЫЦЬ?

**21 лютага – Дзень роднай мовы. Рэдакцыя нашай газеты правяла невялікае анкетаванне студэнтаў універсітэта (біялагічнага, юрыдычнага, псіхолага-педагагічнага, сацыяльна-педагагічнага факультэтаў, факультэта замежных моў і фізічнага выхавання), каб выявіць іх адносіны да беларускай мовы.**

Анкетаванне паказала, што большасць (60%) студэнтаў роднай мовай лічыць менавіта беларускую, 25% – рускую, астатнія 15% не змаглі выбраць сярод дзвюх моў адну і адзначылі, што і рускую, і беларускую прызнаюць за родныя.

На пытанне «Як часта вы карыстаецеся беларускай мовай?» ніхто не адказаў, што часта. 42% апытаных ужываюць родную мову зрэдку, 52% – толькі падчас спецыялізаваных заняткаў. Абнадзейвае той факт, што зусім не карыстаецца беларускай мовай толькі 10% з ліку ўдзельнікаў анкетавання.

Парадавалі адказы на пытанне «Як вы ставіцеся да беларускамоўнага кіно, тэатру, літаратуры і т.п.?». 57% студэнтаў заверыла нас, што станоўча; 30% адказала, што ім усё роўна, рускамоўная ці беларускамоўная наша культура, бо яны разумеюць і тую і другую мовы; 10% прызналася, што станоўча адносяцца да беларускамоўных твораў, толькі амаль не сустракаюць іх у жыцці; адказ «адмоўна» сустракаецца аднойчы, ды і то рэспандэнт адразу прызнаецца, што не беларус па паходжанні.

Не было асаблівага адзінадушша студэнтаў пры адказе на пытанне анкеты, дзе мы прасілі ацаніць становішча беларускай мовы ў нашым грамадстве. Большасць (55%) вызначае яго як нездавальняючае, 30% з гэтым не згодна (адказы «здавальняючае» і «стабільнае»), яшчэ 15% не змаглі адказаць на гэтае пытанне.

Самыя розныя ідэі, часта цалкам гумарыстычныя, прыходзілі ў галаву студэнтам, калі іх папрасілі прапанаваць нейкія канкрэтныя дзеянні дзеля падняцця прэстыжу роднай мовы. Побач са слушнымі, на наш погляд, адказамі пра тое, што трэба пераводзіць на беларускую мову СМІ, тэлебачанне, пачаць выкладаць на беларускай мове ў школе, папулярызаваць беларускую літаратуру (нагадаем, філолагаў сярод рэспандэнтаў не было!), сустракаліся і такія: «увесці сістэму штрафаў», «забараніць размаўляць на рускай мове» (заўважым, што гэты адказ даваўся менавіта па-руску…), «пачаць беларусізацыю».

Калі мы спыталі ў студэнтаў, што ім перашкаджае ўжываць родную мову, многія спасылаліся на яе няведанне, звычку да рускай мовы, а таксама выказвалі няўпэўненасць у тым, што іх зразумеюць.

Што ж, выбар, якую мову ўжываць па-ранейшаму застаецца за кожным з нас, гвалтоўнай беларусізацыі праводзіць ніхто не збіраецца. Аднак нам трэба помніць, што лёс мовы тытульнай нацыі Беларусі знаходзіцца і ў нашых руках.

І. Хоміч

ФОТАФАКТ



***16 лютага адбылася сустрэча рэктара М.Э. Часноўскага з камітэтам першаснай арганізацыі БРСМ універсітэта.***

***Мечыслаў Эдвардавіч пажадаў лідэрам адной з самых шматлікіх моладзевых арганізацый працаваць у тым жа высокім рытме і з тым жа духам патрыятызму.***

***Па ацэнках саміх студэнтаў, падобныя сустрэчы маюць станоўчы рэзананс, выклікаюць новыя ідэі, рашэнні і ініцыятывы.***

## НАШЫ НАВІНЫ

*У 2009 г. адзначалася 600-годдзе запаведнага рэжыму Белавежскай пушчы – найбуйнейшага прыродаахоўнага аб'екту не толькі Беларусі, але і Еўропы. Да гэтай падзеі і прымеркаваны праведзены з 15 кастрычніка па 30 снежня кафедрай інфармацыйных тэхналогій конкурс мульцімедыяпраектаў. Нядаўна сталі вядомы яго вынікі.*

*Мы віншуем: Вольгу Ланчук, студэнтку юрыдычнага факультэта, – І месца; Кацярыну Басалай і Яўгенію Разкалупу, студэнтак біялагічнага факультэта, – ІІ месца; Таццяну Сямкову і Аляксандра Сідаровіча; Міхаіла Кунахаўца і Рамана Ардыцкага – ІІІ месца (усе – студэнты геаграфічнага факультэта)!*

*Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі і прызамі ад камітэта БРСМ універсітэта.*

• • •

*Віншуем вакальнае трыо «Лад» пад кіраўніцтвам Л.І. Борсук са званнем лаўрэата ІІ Міжнароднага фестывалю «Руская песня» (г. Масква)!*

**18 февраля в фойе главного корпуса университета состоялось торжественное открытие межфакультетской студенческой фотовыставки «Брест: прошлое и настоящее», посвящённой 65-летию Великой Победы.**

В открытии принимали участие начальник УВД Брестского облисполкома В.В. Сычевский, его заместитель Г.И. Борисюк, первый проректор университета К.К. Красовский, а также преподаватели кафедры культурологии О.В. Финслер, В.П. Люкевич и Т.М. Тохиян.

Зрители имели возможность познакомиться с авторами работ, представленных на выставке, – студентами психолого-педагогического, математического, биологического, юридического факультетов и факультета иностранных языков. Ребята попытались передать в своих фотоработах красоту и историю родного города. Архитектурные памятники Бреста, творческие коллажи из старых музейных открыток, ночные огни современного городского пейзажа, бытовые зарисовки улиц и людей, великолепные закаты – всё это душа города, которую умеют видеть и чувствовать наши студенты и преподаватели.

*О.В. Финслер*
*(доцент кафедры культурологии)*



## Семінар, прысвечаны Дню роднай мовы, прайшоў на гістарычным факультэце 22 лютага

***Яго падрыхтоўкай займаліся студэнты – удзельнікі навуковага таварыства гістарычнага факультэта: В. Пернач (старшыня СНТ), Р. Заляшчук і С. Ігнатовіч.***

***Акрамя студэнцкіх выступленняў, прагучалі даклады выкладчыкаў: дацэнта кафедры філасофіі Л.В. Перавалавай, загадчыка кафедры беларускага мовазнаўства М.І. Новік і намесніка дэкана гістарычнага факультэта, дацэнта кафедры культуралогіі Т.М. Тахіян.***

***Мерапрыемствы такога кшталту не рэдкасць на гістарычным факультэце. Неўзабаве пройдуць новыя, да ўдзелу ў якіх мы запрашаем усіх студэнтаў нашага універсітэта.***

*Р. Чуль, Ю. Барташ*
*(гістарычны факультэт)*

## НАТАТКІ ВЫКЛАДЧЫКА

# СТУДЭНТЫ ЖАРТУЮЦЬ

**Гэтыя «перлы» я занатаваў пад час выкладання курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» студэнтам геаграфічнага, гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў на працягу апошніх пяці гадоў. Стыль, як кажуць, захаваны поўнасцю. Прапаную вашай ўвазе некаторыя са студэнцкіх выказванняў.**

«Беларуская мова ўзнікла даўно, яшчэ з часоў жыцця *неандэртальцаў*».

«Кірылам была створана *лацінка*, а паслядоўнікамі Кірыла – кірыліца».

«У *XI ст. узнікаіць* кнігадрукаванне на Беларусі. Так Ф. Скарына першы выдаў Біблію ў Празе».

«У першую чаргу развіццё беларускай мовы з цягам часу пачынаецца з складання *двух моў – лацінкі* і *кірыліцы*».

«За ўвесь шлях развіцця беларуская мова *назбірала* шмат помнікаў, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і на падставе якіх выхоўваецца сучаснае пакаленне».

«*Тры* Статуты ВКЛ былі складзены Л. Сапегам».

«Пад час ВКЛ беларуская мова была дзяржаўнай. На ёй размаўлялі сяляне, *гаспадары* і інш.».

«Просты і *няпросты* люд карыстаўся беларускай мовай».

«Францыск Скарына быў *первадрукарнікам* на Беларусі».

«У *XII* ст. Ф. Скарына *пераве́ў* Біблію на старабеларускую мову».

«У гэты час беларуская мованазывалася простай мовай у ВКЛ, а за яго межамі мела назву літоўскай, г.зн. *што беларускай мовы як такавой не было*».

«Трэба ўспомніць калектывізацыю, індустрыялізацыю і *беларусіфікацыю*».

*А.В. Макарэвіч*
*(дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі)*

*(Працяг у наступным нумары газеты)*



## УРАЖАННЕ

**Напярэдадні Дня роднай мовы, 19 лютага, у фае вучэбнага корпуса № 1 супрацоўнікі аддзела выхаваўчай працы з моладдзю правялі флэш-моб «Размаўляй па-беларуску!».**

Добраахвотнікам неабходна было перакласці словы з рускай мовы на беларускую. Здавалася б, лёгкае заданне, але складанасці ўсё ж такі ўзнікалі. Добра, што група падтрымкі заўсёды побач.

За правільна перакладзеныя словы адзнакі не ставіліся, але вось цукеркі ўручаліся! А тым, хто выканаў яшчэ і другое заданне арганізатараў – прачытаў (або праспяваў – было і такое!) на памяць верш на беларускай мове, уручалі CD-дыскі.

Вялікі дзякуй арганізатарам за мора пазітыўных эмоцый!

*Т. Сямкова*
*(геаграфічны факультэт)*

## ПРАЗ АДЛЕГЛАСЦЬ ГАДОЎ

# ЗАСЛУЖЕННЫЙ ТРЕНЕР И ВЕТЕРАН

**В этом году Беларусь празднует 65-летие со дня окончания Великой Отечественной войны. Великая Победа – так до сих пор называют это эпохальное событие.**

**С каждым годом ветеранов войны становится всё меньше, поэтому наш долг не терять времени и общаться с живыми свидетелями тех событий. Наша газета начала рубрику «Праз адлегласць гадоў», в которой будут публиковаться беседы с ветеранами, чья судьба связана с университетом.**

**Первым человеком, с которым мы побеседовали, стал Е.М. Шукевич, ветеран Великой Отечественной войны и Заслуженный тренер СССР.**



**– Евгений Михайлович, где настигла Вас война?**

– В Минске, мне 27 лет было. Я тогда 3-й курс института физкультуры только закончил. О том, что война дошла и до нас – а было это с субботы на воскресенье, – мы стали подозревать ещё в субботу, когда часов в девять в Минске погасло всё освещение.

Группой человек в 19 мы ушли через лес из Минска в направлении Стражицкого городка. В Жодино встретили своего ректора и некоторых преподавателей. Поезд с ними ждать мы не остались и пешком двинулись через леса на Могилёв, куда добрались 1 июля. В Могилёве я стал сержантом, командиром минометного отделения.

**– Каким для Вас запомнилось начало войны?**

– Горящий Минск, бомбёжки… Самолёты заходили с запада, через проспект нынешний. Как налетают очередной раз, ложишься на тротуар, ждёшь, когда всё это закончится, и гадаешь: попадёт или не попадёт. Да, Минск горел… Причём били жилой сектор, горели школы… Первые дни бомбили только окраины со стороны запада, а уже день на четвертый добрались до центра… И залетать начали большими партиями самолётов, в отличие от первых двух дней, когда летали только единицы.

**– А где победу встретили? От кого и когда узнали?**

– Тоже в Минске. Уже числа 5-го мая мы слышали, что осталось совсем немного, скоро победа. Вообще, победное шествие для меня началось с Бобруйской операции, в 1944 году. Я был в партизанах, когда прорывали фронт. У нас был 210-й головной отряд имени Сталина. Многие наши и до Берлина дошли, и до Праги.

**– Как Ваша жизнь стала развиваться после победы?**

– Уже в 1944 году в Осиповичах меня назначили заведующим учебно-спортивного отделом комитета физкультуры и спорта. А потом меня забрали в Минск для подготовки спортивного парада. В феврале 1946-го я получил свой диплом и остался работать в институте преподавателем на кафедре лёгкой атлетики, где 12 лет проработал (сейчас – БГУФК).

Потом в Волгограде работал преподавателем в институте физкультуры. Но моя маленькая дочка очень плохо переносила тот жаркий климат: летом было до плюс 50. И мы решили переехать назад в Беларусь. Мне Брест очень нравился – я бывал тут прежде, когда мы периодически приезжали на зимние соревнования. Очень легкоатлетический манеж мне тут нравился. Так и вернулся сюда в качестве доцента. 10 лет проработал заведующим кафедрой лёгкой атлетики плавания и лыжного спорта, получил звание Заслуженного тренера СССР.

**– Расскажите, как Вы получили это звание?**

– Я был старшим тренером СССР по метанию молота. На Олимпийских играх в Мельбурне мой Михаил Кривоносов был вторым, а до этого он установил 6 мировых рекордов. Анатолий Самоцветов тоже второе место занял. Дмитрий Егоров тоже мой воспитанник. Вот так за подготовку команды к Олимпиаде я и получил Заслуженного тренера. А потом ещё и олимпийский чемпион в Токио Ромуальд Клим, тоже мой…

**– Теперь, когда преподавательская деятельность осталась за плечами, чем увлекаетесь?**

– Читать очень люблю. Начал писать работу «Первопроходцы Олимпийских вершин» – задумал такую книгу. Осталось четыре Олимпиады описать.

Читаю спортивные газеты, телевизор смотрю.

Хотелось бы пожелать, чтобы вся молодежь физической культурой занималась! Это очень важно для её здоровья и долголетия, да и для хорошей работы в любой отрасли. Если человек физически хорошо подготовлен, ему и работается легче!

*М. Кравчук, Ч. Курига*
*(юридический факультет)*

## САКАВІК У ГІСТОРЫІ

*2.03.1917 г. – стварэнне Часовага ўраду ў Расіі.*

*3.03.1639 г. – каледж, заснаваны ў Бостане (ЗША), атрымлівае імя Гарвард у гонар фундатара Джона Гарварда.*

*3.03.1861 г. – Аляксандр II адмяняе прыгоннае права.*

*03.03.1987 г. – амерыканскі баксёр Майк Тайсан заваёўвае тытул Чэмпіёна свету.*

*05.03.1868 г. – у Англіі запатэнтаваны стэплер.*

*06.03.1665 г. – у Лондане выходзіць першы ў свеце часопіс «Філасофскія працы Каралеўскага грамадства».*

*06.03.1868 г. – Д. Мендзялееў паказвае Расійскаму хімічнаму таварыству першую версію перыядычнай табліцы.*

*06.03.1931 г. – газета «Праўда» выходзіць з шапкай паласы «Краіна павінна ведаць сваіх герояў», што стала плакатным лозунгам.*

*07.03.321 г. – па ўказе рымскага імператара Канстанціна I Вялікага нядзеля абвешчана выхадным днём.*

*09.03.1822 г. – Чарльз Грэм патэнтуе штучныя зубы.*

*12.03.1935 г. – Персія пераназвана ў Іран.*

*13.03.1989 г. – вынайдзена сусветнае павуціннe (World Wide Web, WWW), вядомае як інтэрнэт.*

*14.03.1990 г. – М. Гарбачоў абраны прэзідэнтам СССР.*

*15.03.1994 г. – прынята Канстытуцыя Беларусі.*

*16.03.2004 г. – у Лондане выяўлены асабістыя паперы сэра Артура Конана Дойла. Папярэдні кошт знаходкі складае два мільёны фунтаў стэрлінгаў.*

*18.03.1662 г. – у Парыжы пачынае дзейнічаць служба грамадскага транспарту на коннай цязе – 8-мясцовая карэта, названая амнібус («для ўсіх»).*

*Рубрыку вядзе*
*В. Бялюк*
*(гістарычны факультэт)*

# Сустрэліся два святы

**Традыцыйна атрымліваецца, што і мужчынскае і жаночае свята – Дзень абаронцы Айчыны і 8 Сакавіка – прыпадаюць на адзін нумар газеты. Прааналізаваўшы ўсе плюсы і мінусы такога становішча спраў, я прыйшла да высновы, што дадатныя бакі яго ўсё ж пераважваюць. Гэта ж якая цудоўная магчымасць для тых і другіх абмяняцца кампліментамі, віншаваннямі і іншымі прыемнасцямі! Што ж, вам слова!**

**І.** *Хоміч (рэдактар)*

**О.А. Фелькина,** декан филологического факультета:



– Говорят, всем мужчинам к лицу военная форма. Но главное всё же не форма, а содержание. Поэтому мне нравится новое название праздника 23 февраля – День защитника Отечества. Поздравляю с этим праздником мужчин, всегда готовых защитить Родину, свой дом, своих близких. Желаю им мужества, здоровья и сил! А главное – большой любви, ибо только то, что любишь, имеет смысл защищать!

**С.А. Марзан,** проректор по науке и экономике:



– Дорогие, милые женщины!

От всей души поздравляю Вас с 8 Марта! В этот светлый, всеми любимый праздник мы, мужчины, с чувством глубокого уважения и признательности, от всей души и сердца дарим цветы и улыбки нашим дорогим и любимым. Именно вы делаете сильную половину человечества ещё сильнее, а мир вокруг – гармоничнее и добрее. Вы удивительно умеете совмещать домашние заботы с профессиональной и общественной деятельностью.

Семейного вам счастья, улыбок и благополучия, молодости и здоровья на долгие годы! Пусть начало весны принесет вам радость и удачу, надежду на лучшее, мир и покой в вашей семье, пусть женское очарование никогда не покидает вас!

**Е.И. Гурина,** замдекана по воспитательной работе биологического факультета:



– Уважаемые мужчины! От лица женской половины биологического факультета поздравляю вас с замечательным праздником – Днём защитника Отечества. Мы желаем вам богатырского здоровья, мужественности, галантности, счастья и удачи. Оставайтесь сильной половиной человечества, на которую мы, женщины, всегда сможем положиться.

**А.С. Голёнко,** завкафедрой лёгкой атлетики, плавания и лыжного спорта:



– Первый весенний праздник, наверное, не случайно женский. После студёной зимы хочется красок и солнечного света. Холодные сердца мужчин оттаивают, и мужских уст в этот праздничный день льются нежные, тёплые слова восхищений, признаний, поздравлений.

Мне хотелось бы произнести всем женщинам стихи моего друга (спортсмена, поэта, музыканта, актёра, учителя, тренера) И.З. Саушкевича:

Прекрасна Женщина-богиня!  
Прекрасна Женщина-весталка!  
Графиня, прачка и рабыня –  
И жизнь за них отдать не жалко.  
Нетленна Женщина по сути –  
Мы лет её не замечаем,  
Среди житейской лжи и мути  
Ей пьедесталы воздвигаем.  
Так будь во век неповторима  
Своею сущностью великой!  
Многострадальным пилигримом  
Перед твоим склоняюсь ликом.

**М. Самойлюк,** филологический факультет (обладатель звания «Студент года–2009»):



– Дорогие наши мужчины! От чистого сердца поздравляю вас с праздником! Оставайтесь такими же храбрыми и мужественными защитниками Отечества и нас, женщин!

**М. Кунда,** факультет физвоспитания (участник Олимпийских игр–2008):



– Будьте внимательными  
и крепко  
любимыми,  
простыми,  
обаятельными,  
неповторимыми,  
и добрыми,  
и строгими,  
и слабыми, и сильными,  
хорошими, и нежными,  
и самыми красивыми!

**23 февраля – праздник, во время которого мужчины могут, не стесняясь, без ложной скромности, принимать подарки**

## В праздник, истинно мужской

**от женщин. За поздравлением мужчинам от имени прекрасной половины человечества я отправилась к женщине – декану родного юридического факультета. Елена Николаевна радушно приняла незваную гостью, несмотря на плотный график, и любезно согласилась побеседовать.**

**– Елена Николаевна, с чем у Вас ассоциируется 23 Февраля?**

– Это праздник, благодаря которому сильная половина человечества получает законное право принимать от женщин поздравления, благодарности и, конечно, подарки. (Елена Николаевна не удержалась добавить в понимание праздника юридической окраски. – Авт.) А для прекрасной половины – это возможность восхвалять (а следовательно, утверждать в обществе) такие истинно мужские качества, как преданность, храбрость, верность долгу, присяге, жене, подруге. Или просто выразить признательность за помощь и поддержку.

**– Празднуете ли Вы этот праздник дома?**

– При отсутствии гендерного паритета в семье (1 мужчина – 2 женщины: я и дочь), наш единственный мужчина пользуется (совершенно заслуженно) всеми привилегиями мужского праздника: поздравляем, дарим подарки, готовим вкусный ужин.

**– Что бы от имени всех представительниц женского пола факультета пожелали мужчинам университета?**

– В истинно мужской праздник хочется, в первую очередь, пожелать сберечь здоровье. Ведь это то, что позволит защитить Родину, дом, семью, близких, родных и любимых. То, без чего нельзя в полной мере обеспечить семью, а это важное для мужчины дело; сохранить память, чтобы не забывать названия любимых цветов, духов жены или подруги (куда ж нынче без романтики и рыцарства?), помнить день свадьбы и размер кольца – это тоже достаточно важно в современном мире для определения качеств настоящего мужчины. Хочется пожелать не растерять в современном, достаточно сложном и жёстком мире щедрость души и чувство юмора. Это обязательно поможет сохранить стойкость, силу, выдержку и мужество.

**Присоединяемся к словам декана юридического факультета и хотим выразить слова признательности просто за то, мужчины и юноши, что вы есть, что с вами мир интереснее и безопаснее вдвойне.**

*А. Лось*

## У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

# ЧТО ДЕЛАТЬ В ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ?



**19 февраля юридический факультет праздновал День рождения. А что мы делаем в День рождения? Веселимся и пытаемся как-то по-особенному поздравить виновника торжества.**

Студенты юрфака безумно счастливы, что в 1996-м на свет появился младенец-юрфак, поэтому праздновать начали за два дня до 14-летия факультета... игрой в боулинг. Есть у юрфака необъяснимая и безудержная тяга к этому виду спорта.

Собрались добры молодцы и красны девицы пятью командами и разыграли между собой торт. Естественно, не пропустили этакое действо и преподаватели юрфака: кому как не им знать уязвимые точки, казалось бы, стойкой пирамиды кеглей. Они ведь знают слабые места в «прочных» знаниях студентов и порой, как это ни печально, камня на камне не оставляют от выстроенной ими пирамиды знаний.

После испытания боулингом решили юристы поразвлечься высокоинтеллектуальными играми, побаловать свой пока намертвоуснувший до сессии ум каверзными вопросиками. Пришлось показать знания и в музыке, и в литературе, и в кинематографе, и даже в журналистике и изобразительном искусстве. Логично, что победа досталась четвёртому курсу: у них ведь опыта побольше.

После подтверждения интеллектуального соответствия гордому званию «юрист» захотелось побегать. Надо же, чтоб весь университет видел и слышал, что юрфак сегодня – именинник. Ох, и досталось же первому курсу от старших товарищей! Чтобы жизнь мёдом не казалась, погоняли мы его по всем корпусам университета и даже в деканат, к Елене Николаевне, отправили (не все бывали в святая святых юридического факультета).

Не остался в долгу и факультет. Побаловал студентов за их старания и призами и подарками. Зная просто мистическую тягу студентов ко всему халявному, студенческий совет юридического факультета при помощи и поддержке деканата устроил на большой перемене беспроигрышную лотерею и придумал массу интереснейших конкурсов.

Предложили студентам надеть боксёрские перчатки и… нет, не отомстить преподавателям за проваленную сессию, а развязать платок.

Ещё интереснее оказался конкурс «Бурёнка». Не раз слыша, что работы юристам не найти, студенты устроили мастер-класс по работе в сельском хозяйстве. Сколько было смеха, когда «доением» занимались парни! (Кстати, они в этом конкурсе были самыми активными.)

Активничали юноши и в конкурсе, где их привязывали к красивой девушке и просили освободиться, не развязывая рук. Парни всячески крутились-выкручивались, нарезали круги вокруг девушки, короче, делали вид, что пытаются понять, как же им побыстрее выпутаться. А на самом деле, старались девушку всё приобнять, да в глазки заглянуть, комплимент сделать – девушке понравиться, а не приз получить.

Наполучив подарков, заряд энергии, бодрости и веселья, спать мы как-то совсем не хотели, так что закрывала череду празднований именно дискотека. За эти дни мы понабрались энергии и эмоций надолго… ну по крайней мере до следующего праздника.

*А. Лось*
*(юридический факультет)*

## ФОТАФАКТ

***24 лютага прайшоў круглы стол, на якім разглядаліся пытанні рэалізацыі мэтавай праграмы «Валанцёрская дзейнасць студэнтаў» (на 2009 – 2010 гг.).***



*Мазгавы штурм: студэнты прапануюць шляхі вырашэння праблем, якія з'яўляюцца ў валанцёрскай дзейнасці*

ДЗЕ ЯНЫ ЦЯПЕР?

## НАШЫ НАВІНЫ

***10 лютага прайшлі заняткі ў «Школе куратара». Куратары студэнцкіх груп абмяркоўвалі пытанне «Духоўна-эстэтычнае выхаванне студэнтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна». Пачала размову старшы выкладчык кафедры культуралогіі Т.А. Бакуменка.***

***Тэма не пакінула абыякавым нікога. Гэта адразу было відаць па гарачых спрэчках, якія разварнуліся напрыканцы заняткаў. Спрачаліся, у асноўным, пра тое, ці здольная сучасная культура эпохі постмадэрна выхаваць высокамаральную асобу.***

***Не менш цікавым быў для аўдыторыі пошук адказу на пытанні, які ён, сучасны студэнт, і што яму цікава, якія метады выхаваўчай працы дарэчы выкарыстоўваць у студэнцкім асяродку.***

***Невядома, ці нарадзілася ў спрэчцы ісціна, як невядома, ці можа быць наогул ісціна ў пытаннях выхавання, аднак абмеркаванне праблем ўжо ёсць сведчанне агульнай зацікаўленасці ў іх вырашэнні.***

# ЗАНИМАЙТЕСЬ, ЛЮДИ, СПОРТОМ!

**Кэвээнщик, начинающий тренер и просто любящий муж и папа! Знакомьтесь – выпускник факультета физического воспитания 2007 года и преподаватель кафедры спортивных дисциплин Андрей Андреевич Палагин!!!**

**– Когда Вы начали увлекаться спортом?**

– В принципе, у меня всё детство было с ним связано. Класса с пятого мы с друзьями начали увлекаться гандболом. А потом на базе Малоритской СШ №3 создали спецкласс по гандболу, где были и женская и мужская команды. Из них человек 6 связали свою жизнь со спортом, в основном с тренерской работой.

**– То есть Вы сразу решили связать свою будущую жизнь со спортом?**

– Ну на самом деле, как и у любого другого абитуриента, у меня было много мучений! Но в итоге в последний момент всё-таки решил податься дальше в спорт. И сожалений никаких до сих пор не возникло!

**– А что больше всего Вам запомнилось из студенческой жизни?**

– Сессии, наверное. Чтобы удачно сдать сессию, нужно недюжинную смекалку проявить. Ведь иногда сдача экзаменов проходит больше на соображении, нежели на знаниях. Правда, об этом говорить могу только сейчас. Было и несколько очень ярких экзаменов, когда преподаватель слышал то, что хотел услышать, но я, объективно оценивая свои знания, понимал, что этой оценки я не совсем достоин.

**– Были ли свои секреты в сдаче экзаменов?**

– Залогом успеха у меня была максимальная подготовка. Был и такой принцип: начитаться определённой терминологии по соответствующему предмету, понять эту терминологию, а там уже смотреть по обстоятельствам.

**– Вы до сих пор играете в КВН. Как попали туда впервые?**

– Ещё в школе я постоянно участвовал в различных фестивалях. Был такой фонд «Детям Чернобыля», при котором мы готовили различные выступления и ездили в Минск. Потом меня заинтересовал КВН... Поступив, первым делом я пытался узнать о команде КВН на факультете и университете. В нашем университете есть такая прекрасная форма попадания в команду – проявить себя на фестивале «Первокурсник», где действующие члены команды подбирают новичков. Так случилось и со мной.

**– Учёба, КВН, тренировки… На личную жизнь времени хватало?**

– Я всё хорошо совмещал… В 20 лет (на 4-м курсе) уже женился, к чему был вполне готов. Вот сейчас уже дочка подрастает!



**– А дочку тоже в спорт планируете отправить?**

– Я считаю, что ребёнку нужно показать всё: и музыку, и рисование, и спорт. Даже можно несколько видов спорта попробовать по мере взросления. То, что не нужно – само собой отпадёт. Главное – выбор предоставить, а там ребёнок сам поймёт и решит, что ему больше по душе.

**– А чего, возможно, не хватает у нас для развития спорта?**

– Ой, даже не знаю… Финансирование на спорт со стороны государства колоссальное. Вопрос только в нехватке времени для развития. Взять, к примеру, развитие гандбола у нас и в странах Европы. Там всё зарождалось ещё в 19-м веке, и сейчас уже серьёзные традиции сложились. У нас же сейчас только 19-й век по меркам Европы.

**– Что бы Вы хотели сказать нашим читателям?**

– Университету стабильности хотелось бы пожелать. А студентам нужно смекалку развивать! И жизненную изворотливость! Нужно научиться в жизни действовать по обстоятельствам, а не по плану какому- то.

В сессию уметь распределить время и силы, чтобы к последнему экзамену не прийти абсолютно бессильным. А ещё… занимайтесь, люди, спортом! Чтобы быть здоровыми и сильными!

*М. Кравчук*
*(юридический факультет)*

## POST FAKTUM: ДЗЕНЬ ЗАКАХАНЫХ

**Нас з дзяцінства вучылі: рабі людзям тое, што хочаш, каб рабілі табе. Гаварылі, што нельга крыўдзіць слабых і ашукваць. Нагадвалі, каб саступалі месца старэйшым.**

Ці выконвалі мы гэта? Не заўсёды. Зараз, ужо дарослыя, мы таксама не перфектныя. Спісваем, хоць праз некалькі гадоў самі станем настаўнікамі. Спазняемся на заняткі і нясем нейкую лухту аб корках на дарозе і ліфце, які ламаецца ў самы нечаканы момант. Тым не менш, мы адрозніваемся ад сябе ў дзяцінстве: бачачы чужое гора, ужо не застаемся да іх безуважнымі.

15 лютага на факультэце замежных моў прайшла акцыя «Сэрца аддаю дзецям». У гэты дзень пры ўваходзе ў корпус кожны мог заўважыць дзяўчат, якія прапаноўвалі абмяняць валянцінкі на грашовае ахвяраванне для выхаванцаў Кобрынскага дзіцячага дома.



Валянцінак было мора, а ад жадаючых іх набыць не было адбою. Мне пашчасціла знайсці сярод такой шматстайнасці адну памяранцавага колеру валянцінку а-ля «хэнд-мэйд» з подпісам: «прызнавацца ў каханні вельмі лёгкая… твае вачаняткі – што зорачкі на небе, ты самая яркая з зорак на маім небасхіле». Няхай ведае яе аўтар, што яго тварэнне пацешыла многіх.

Хай мы і не сабралі мільёнаў, але яшчэ раз успомнілі аб тым, што ёсць побач з намі людзі, якім патрэбна наша дапамога і ўдзел. Магчыма, усведамленне гэтага зменіць жыццё яшчэ не аднаго жыхара планеты Зямля.

*К. Марыневіч*
*(факультэт замежных моў)*

## ХОЧУ ЖЕНИТЬСЯ!

**Любовь-любовь… как много в этом слове!**

**И что только не придумают люди в день, когда любовь становится праздником! А студенты математического факультета тем более на выдумки горазды. «Ну вот и началось…» – сказали преподаватели.**

Украшение факультета, гадание (в роли гадалки – Инна Карабан) и беспроигрышная лотерея (главным призом в которой были пригласительные на две персоны в кино) не были таким достоянием, как миниатюрный ЗАГС, где все желающие могли «узаконить» свои отношения. ЗАГС привлёк внимание не только студентов-математиков, но и ребят с других факультетов.



Сам процесс бракосочетания проходил как в самом настоящем ЗАГСе. Невеста в фате с букетом в руках и жених, шею которого украшала гламурная бабочка, подходили к столу регистратора (Анне Кондратюк) под звуки вальса Мендельсона. Дав согласие на заключение брака, они ставили свои подписи и обменивались кольцами. Несмотря на то что ЗАГС был ненастоящим, наблюдалось волнение женихов, дрожание их рук и сияющие улыбки на лицах молодых невест. В конце процесса бракосочетания «молодожёны» танцевали свой первый «семейный» танец и получали «Свидетельства о регистрации влюблённых», удостоверенные святым Валентином.

Но в нашем импровизированном ЗАГСе действовали и свои законы: пожениться мог кто хочет, с кем хочет и сколько угодно раз. (Сами успели пару раз выйти замуж.)

Впечатления остались настолько яркими, что появилась надежда: мини-ЗАГС станет ещё одной традицией матфака.

Ну что ж… Ещё раз с Днём Святого Валентина всех… Любите и будьте любимы!

*Ю. Яцкевич*
*Д. Козельская*
*(математический факультет)*

***12 лютага ў КДЦ «DIXI» прайшоў вечар, прысвечаны Дню святога Валянціна.***

***Арганізатар мерапрыемства – камітэт БРСМ універсітэта – меў на мэце не толькі наладзіць вясёлую забаву для студэнтаў, але і дапамогу хворым дзецям. Сабраныя за час святочнага вечара сродкі цалкам пайшлі на падарункі пацыентам Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы.***

***19 лютага актывісты моладзевай грамадскай арганізацыі даставілі ўсе падарункі да месца прызначэння…***

***Дадзеным мерапрыемствам завяршылася штогадовая акцыя «Каляднае цяпло–2010».***

## ЗОРКА

*Мабыць, сталася нешта з небам,*
*што ў хвіліны мае агорклыя*
*мне сыпнула не маннай, не хлебам,*
*а зоркамі.*

*Звар'яцелая зорка нейкая*
*Да маіх босых ног упала.*
*Мне здаецца: была яна век мая,*
*і ўжо век, як яе не стала.*

*Але вось яна – прыгажуня,*
*хуткалёткая, гнуткацелая...*
*Як святлом тваім даражу я,*
*звар'яцелая зорка мая, звар'яцелы я!*

*Сто разоў буду небу дзякаваць,*
*што не манны дало мне, не хлеба...*
*Ты прымаеш мяне.*
*Усякага... Ты такая мне толькі і трэба!*

*М. Аляхновіч*
*(загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі)*

«Берасцейскі універсітэт» № 11 (131)

**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – Р.У. Хрыстафораў.
Карэктар – К.В. Каханчык.
Куратар – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 2.03.2010.
Аб'ём 1,25 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 78.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***